TV@R

Эмілія ПРАНСКУТЭ:

«Я НЕ АГУЧВАЮ СПЛЮШЫКА, А ЖЫВУ ІМ»

Акцёрства ў ёй праяўлялася з ранніх гадоў. Яно маскіравалася пад бунтарства, цікавую гульню, калі нават нелюбімыя справы рабіліся з задавальненнем, бо дзяўчынка ўяўляла, быццам здымаецца ў кіно... Сёння Эмілія Пранскутэ працуе не толькі на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага, але і на тэлебачанні. Менавіта яе голасам размаўляе чароўны герой Сплюшык у праграмах «Дабраранак» і «Калыханка» на тэлеканале «Беларусь-3». Пра лекавыя ўласцівасці сцэны, веру ў цуды і магчымасць вярнуцца ў дзяцінства наша гераіня ведае з уласнага вопыту.

— Вас называюць «мамай» Сплюшыка з «Калыханкі». Хто ён і як з'явіўся?

— Гэта фантазійны персанаж, які, па ідэі, з'яўляецца пажам Феі сноў у праграме. Задумваючы яго, мы вызначылі яго ролю так: калі дзеці засынаюць, ён іх наведвае, каб паправіць падушку ці коўдру. Чым тлумачыцца і наяўнасць у яго крылаў. Прыдумлялі яго разам з кіраўніцай рэдакцыі дзіцячых праграм Белтэлерадыёкампаніі Аленай Будрыцовай і мастачкай Наталляй Кудашкінай, яна мастак-лялечнік, стварала і лісічку Яну з мядзведзікам Топам. Сядзелі мы, фантазіравалі, і кожны дзяліўся бачаннем вобразу Сплюшыка. Калі намалявалі яго і вылепілі, то сутыкнуліся з праблемай: з чаго ж зрабіць гэтую істоту? І Наташа пэўны час мучылася над гэтым пытаннем, а потым неяк у краме знайшла кофтачку, якая стала фактурай для вобліку нашага казачнага героя. Мне здаецца, яму пасуе.

— Улічваючы ваш удзел у стварэнні персанажа і тое, што вы яго агучваеце, як вы ставіцеся да яго?

— Я катэгарычна не згодна з тым, што я яго агучваю, бо мы насамрэч жывём сваімі героямі на здымачнай пляцоўцы. Для мяне як для актрысы вельмі важны момант, што я не проста прыйшла на працу, дзе даручылі асвойваць новую ролю, а ў мяне з'явілася дзіця, дзякуючы якому я і мае калегі Уладзімір Варанкоў і Іна Ганчар маем магчымасць вярнуцца ў дзяцінства. Сур'ёзна! Нам пішуць сцэнарый, але мы настолькі пераўвасабляемся, што не адчуваем сябе дарослымі. І нам гэта вельмі падабаецца.

— Чытала расповеды вашых калег, што часам, прыдумляючы цікавыя дзеянні для вашых персанажаў, сцэнарысты занадта захапляюцца. Са Сплюшыкам такія сітуацыі здараліся?

— Такое бывае перыядычна ў нас на здымках. Паколькі мы працуем з лялькамі, то некаторыя дзеянні складана выканаць. Аднак чароўная сіла тэлебачання дапамагае знайсці выйсце з любой сітуацыі. Напрыклад, неяк мой Сплюшык па сцэнарыі павінен быў катацца на каньках. Разам з рэжысёрам і мастаком мы змаглі зрабіць цуд — ён катаўся! Потым я думала: «Навошта зрабілі гэта? Цяпер жа сцэнарысты яшчэ не такое прыдумаюць!» У нас ёсць людзі, якія заўсёды дапамогуць зняць любую сітуацыю максімальна набліжана да рэальнасці. Калі ў некага ў працэсе ўзнікаюць свае ідэі, то і іх мы агучваем. Заўсёды ёсць месца імправізацыі і магчымасці пры жаданні карэкціраваць сцэнарый.

— Якой вы самі былі ў дзяцінстве?

— З мяне хацелі выхаваць паслухмяную дзяўчынку, а я любіла хуліганіць. Нават не ведаю, як маім бацькам удалося перажыць усе мае выхадкі. З пяці гадоў мяне аддалі вучыцца іграць на скрыпцы. Не магу сказаць, што занятак гэты мне не падабаўся, але штодзённая патрэба практыкавацца выклікалі мае абурэнне і пратэст. Бо пакуль я гадзінамі займалася, іншыя дзеці весела бавілі час на вуліцы. І вось неяк (праўда, тое здарылася ўжо ў класе шостым) прыйшоў у госці мой дзядзька, у якога была загіпсаваная рука. І так атрымалася, што ён пакінуў гіпс у нас. Я вырашыла забраць яго сабе і, прыматаўшы да рукі, пайшла да сваёй выкладчыцы па скрыпцы. Прагульвала заняткі па спецыяльнасці, пакуль маме не патэлефанавалі, каб пацікавіцца, як там мая рука. Бацькі былі шакіраваны, і мне ўляцела... Сёння я ўдзячна маме з татам, што прайшла праз «пакуты» ігры на скрыпцы, але з дзяцінства я была авантурысткай.

— Бесшабашнасць засталася і сёння ў вашым характары?

— Безумоўна! Я не ўяўляю, як без яе можна жыць. Нават мой прыезд з Вільнюса ў Мінск быў у свой час безразважным учынкам. У 17 гадоў я сказала дома, што кідаю іграць на скрыпцы, бо вырашыла стаць актрысай. Проста ўзяла і без ваганняў паехала ў іншы горад. Так праяўляліся мае пратэст і характар.

— А праграму «Калыханка» таксама глядзелі маленькай?

— У часы майго дзяцінства не было такога разнастайнага выбару дзіцячых перадач і мультфільмаў. Але мы са стрыечнай сястрой глядзелі маскоўскую «Спокойной ночи, малыши», якая доўжылася 15 хвілін, і паспявалі потым пaглядзець яшчэ нашу літоўскую «калыханку», якую лічылі лепшай, бо яна ішла паўгадзіны. Глядзелі два мультфільмы за вечар і заўсёды спрабавалі ўявіць людзей, чыімі галасамі размаўлялі жабкі альбо мядзведзікі ў іх.

Я не проста прыйшла на працу, дзе даручылі асвойваць новую ролю, а ў мяне з'явілася дзіця, дзякуючы якому я і мае калегі Уладзімір Варанкоў і Іна Ганчар маем магчымасць вярнуцца ў дзяцінства.

— На ваш погляд, наколькі важна глядзець з дзецьмі «Калыханку», чытаць ім казкі перад сном?

— Сёння мульцікі для дзяцей даступныя ў вялікай колькасці і можна выбіраць любы зручны час для прагляду ўлюбёных праграм. Прайшлі часы, калі ўсё дзіцячае насельніцтва збіралася ля экранаў. Але, спадзяюся, ёсць тыя, хто выбірае кожны вечар кампанію нашай «Калыханкі», бо дзеля гэтага працуе наша каманда.

А наконт казак магу сказаць наступнае: для дзіцяці казка з'яўляецца мадэллю жыццёвага вопыту. І, як ні дзіўна, дзеці любяць пастаянства, таму, бывае, сын ці дачка хочуць слухаць адну і тую ж гісторыю. Нават ведаючы яе на памяць, усё роўна выбіраюць. Усе звыклыя для нас рэчы для дзіцяці — новыя адкрыцці, а дарослыя часам забываюць пра гэта. Я, напрыклад, падчас здымак праграмы паглыбляюся ў свайго персанажа і маю магчымасць паглядзець на свет вачыма дзіцяці.

— Няўжо і ў цуды верыце?

— Так, напрыклад, хутка ў нас прэм'ера спектакля «Хітрыкі Ханумы», і для мяне гэта чаканне цуду, бо невядома, што атрымаецца, як адрэагуе на яго глядач. Вясна наступіла, самалёты лётаюць — для мяне гэта сведчанне цуду. Сяброўства, каханне — таксама яго праявы.

— Раскажыце пра сваю гераіню ў прэм'ерным спектаклі...

— Я пакуль што не магу дакладна сказаць вам, якая яна. Ведаеце, ёсць асацыяцыя «што такое роля»: уявіце, у вас ёсць родзіч, пра якога вы шмат ведаеце, але ніколі з ім не бачыліся. І вось толькі пры сустрэчы твар у твар вы зможаце зразумець, хто ён і чым дыхае. У мяне такі момант сустрэчы будзе на прэм'ерным паказе. З таго, што я ведаю пра Хануму сёння, — гэта ўнікальная жанчына, прафесіяналка сваёй справы і гісторыя пра яе.

— Сцэна можа ратаваць ад рэальнасці?

— Яна, здараецца, лечыць у літаральным сэнсе. І акцёрам такая яе ўласцівасць вядомая. Я не магу ніяк патлумачыць гэты феномен. Бывае, у такім кантэксце кажуць пра гераізм акцёраў, калі яны выходзяць іграць спектакль пасля смерці блізкага чалавека ці нейкай іншай нягоды. Я не бачу ў гэтым гераізму, прабачце за цынізм, але згодна з тым, што чалавек існуе на час спектаклю ў іншай рэальнасці, якая яго ратуе.

— Вас можна сустрэць у тэатры ў якасці гледача?

— Тэатр — месца абмену энергіяй акцёра і гледачоў. Кожны спектакль унікальны і адбываецца толькі тут і цяпер. Калі паглядзіце нейкую пастаноўку сёння, то праз месяц вашы ўражанні ад яе будуць зусім іншымі. Таму я стараюся наведваць спектаклі, каб і за калег парадавацца, і задавальненне атрымаць.

— Калі спектакль пастаўлены няўдала, выказваеце крытыку?

— Не заўсёды «дрэннае» трэба расцэньваць як няўдачу. І па прэм'ерным паказе нельга складаць ацэнку: здараецца, «стрэліць» спектакль, які адыгралі на адрэналіне, а потым «застаецца кароль голым». Альбо наадварот, заўважаеш тут і там недахопы, аднак разумееш, што акцёры разыграюцца — і ўсё стане на свае месцы. У ацэнках чужой і нават сваёй працы мы ўсе суб'ектыўныя і, напрыклад, мне можа не спадабацца, а публіка будзе задаволеная. Пра сябе магу дакладна сказаць: калі бачу недапрацоўку, то хваліць не стану.

Фея сноў (Алена БІКРЭНЕВА) са Сплюшыкам.

Алена ДРАПКО.

■ Віктарына

КАДРЫ З УСМЕШКАЙ

Напярэдадні Дня смеху прапануем вам, шаноўныя чытачы, праверыць сваю памяць і «прайсціся» па любімых савецкіх і постсавецкіх кінакамедыях (у тым ліку знятых на «Беларусьфільме»). Не засмучайцеся, калі нешта не ўзгадаеце — правільныя адказы змешчаны напрыканцы.

1. Каб адвадзіць бусла з вёскі, што хутка пойдзе пад знос, Васька Ходас з «Белых Росаў» залез у буслянку і іграў на баяне... Якую мелодыю?

а) «Касіў Ясь канюшыну»;
б) «Пакуты» («Я хадзіў па белу свету...»);
в) «Мільён пунсовых руж»;
г) «Полька беларуская».

2. Якую страву патрабаваў стомлены хатнімі далікатэсамі герой Фрунзіка Мкртчана з фільма «Пустая мітусня» (рус. «Суета сует»)?

а) яечню з 2 жаўткамі;
б) аўсянку;
в) каўбаскі па-слуцку;
г) катлету за 12 капеек.

3. У камедыі «Пакроўскія вароты» Сава Ігнатавіч — акардэаніст-аматар і мастак па метале — з захапленнем пералічваў знаёмым назвы сваіх любімых інструментаў. Што з пералічанага ён НЕ называў?

а) шпіцштыхель;
б) месэрштыхель;
в) болштыхель.

4. Інкасатар з фільма «7 старых і адна дзяўчына» — дарма што ўжо на пенсіі, а нюх захаваў хвацкі — таму і злодзея, які скраў грошы, пачуў. А потым строга спытаў небараку: «Што піў?». Які быў адказ?

а) рабінаўку;
б) «Жыгулёўскае»;
в) «Зуброўку»;
г) учарашні кефір.

5. Падпольны маклер з фільма «Па сямейных абставінах» выкарыстоўваў сістэму пароляў — так, кватэры ён называў кофтачкамі. А ў што ператварыліся вокны?

а) гузікі
б) кішэні
в) рукавы.

6. Пільны вахцёр пацікавіўся ў герояў стужкі «Джэнтльмены ўдачы», з якога яны спартыўнага таварыства. Што тыя адказалі?

а) «Дынама»;
б) «Працоўныя рэзервы»;
в) «Лакаматыў»;
г) «Ураджай».

7. Куды, паводле слоў героя кінакамедыі Л.Гайдая «Дзелавыя людзі» (навела «Важак чырванаскурых»), можна паспець збегчы ад маленькага невыноснага хлопчыка за 10 хвілін?

а) да Аляскі
б) у Рыа-дэ-Жанэйра
в) да канадскай мяжы.

8. Што, паводле «справаздачы» сваіх турэмшчыкаў, зрабіла спартсменка, камсамолка і проста прыгажуня Ніна з камедыі «Каўказская палонніца» з трыма порцыямі шашлыку?

а) выкінула ў бездань
б) з'ела
в) скарміла сабаку
г) ахвяравала дзецям Афрыкі.

9. Упершыню вобраз героя раманаў І.Ільфа і Я.Пятрова Астапа Бендэра ўвасобіў на кінаэкране Сяргей Юрскі ў 1968 годзе. Пазней ролю Астапа выконвалі многія айчынныя і замежныя акцёры ў шматлікіх экранізацыях «Залатога цяляці» і «12 крэслаў». А хто з пералічаных ніжэй акцёраў «вялікім камбінатарам» ніколі не быў?

а) Арчыл Гаміяшвілі;
б) Андрэй Міронаў;
в) Фрэнк Ланджэла;
г) Мікалай Фаменка;
д) Георгій Дэліеў.

10. Экспрэс-тэст — адгадайце, з якіх камедый гэтыя кінакадры? Падказка: згаданыя фільмы былі зняты ў 1964, 1974, 1984, 1994 і 2004 гадах.

АДКАЗЫ

1. в

2. г Цалкам гэты выразны ўрывак гучыць так: «Я не хачу аблізваць пальцы, разынак і чарнасліву! Я хачу простую чалавечую катлету за 12 капеек!»

3. б

4. в

5. а

6. б

7. в

8. а

9. А вось і ўсе былі! У тым ліку Георгій Дэліеў — у нямецкай экранізацыі «12 Stuhle» 2004 года. Гэтае пытанне — тэст на ўважлівасць.

10. 1 — «Саламяны капялюшык» (1974); 2 — «Сардэчна запрашаем, або Пабочным уваход забаронены!» (1964); 3 — «Трэці не лішні» (1994). Так-так, вы не памыліліся — аніматара сыграў малады Аляксандр Ціхановіч; 4 — «Каханне і галубы» (1984); 5 — «Жаніцьба Бальзамінава» (1964); 6 — «Зайчык» (1964); 7 — «Асаблівасці нацыянальнага палявання» (1994); 8 — «Маленькія ўцекачы» (2004, «Беларусьфільм»); 9 — «Тры дні ў Маскве» (1974).

■ Медыяпрастора

«ЗЯЛЁНАЯ ХВАЛЯ»

Брэст 106.6 FM
Віцебск 101.8 FM
Мінск 107.1 FM
Гродна 104.2 FM
Магілёў 107.8 FM
Бабруйск 103.6 FM
Баранавічы 98.4 FM
Салігорск 104.3 FM
Пінск 103.2 FM

Кіроўцы часта здзяйсняюць сур'ёзныя парушэнні: і хуткаснага рэжыму, і правілаў перавозкі пасажыраў, і іншых устаноўленых нормаў паводзін на дарозе. Парушаюць правілы і пешаходы. Ці можам мы выправіць сітуацыю і зрабіць нашы дарогі бяспечнейшымі?

Праграма «Зялёная хваля» — сумесны праект радыё «Мір» і УДАІ МУС Рэспублікі Беларусь, дзе любы ахвотны можа задаць сваё пытанне і атрымаць кампетэнтны адказ. На працягу якога часу можна прайсці пераправеркі на наяўнасць алкаголю ў крыві? Які штраф чакае за мыццё аўто ў двары дома? Ці патрэбна страхоўка на мапед? Ці штрафуюць паўторна за няпройдзены тэхагляд? Ці можна вазіць бейсбольную біту ў машыне? На гэтыя і многія іншыя пытанні ў прамым эфіры радыё «Мір» даюць адказ прадстаўнікі ДАІ.

Кожную сераду з 14.15 тэлефануйце ў прамы эфір па тэлефоне ў Мінску 2-101-471, адпраўляйце SMS на кароткі нумар 1071 або пакідайце свае пытанні на сайце radiomir.by. Мы дапаможам граматна вырашыць вашыя аўтамабільныя праблемы на нашай «мірнай» хвалі.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Шаноўныя сябры!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на II квартал 2014 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Індэкс/перыяд	1 месяц	3 месяцы
63850 (для індывідуальных падпісчыкаў)	47 500	142 500
63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў)	42 750	128 250
63858 (для ведамасных падпісчыкаў)	95 300	285 900
63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя)	85 800	257 400

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

ПАНЯДЗЕЛАК, 31 САКАВІКА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 19.40, 0.10 Зона Х.
9.10 Галоўны эфір.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.50 Журналісцкае расследаванне.
11.20 БеларусьLIFE.
11.40 Eurovision. Вынікі тыдня.
12.10, 0.55 Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
13.10 Серыял «Дыхай са мной. Шчасце ў пазыку». 1-я і 2-я серыі.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 1.45 Серыял «След». 1-я серыя.
16.30 «Сямейныя меладрамы». 1-ы выпуск.
17.35 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
19.55 Форум.
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «Ганна Герман».
23.55 Актуальнае інтэрв'ю.
0.45 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 10.05, 21.30 Тэлебарометр.
9.05, 17.55 Серыял «Двое з куфра».
10.40 Серыял «Я — целаахоўнік».
11.50 Серыял «Ластаўчына гняздо».
14.00 «Жаночая ліга. Хлопцы. Грошы. Каханне».
14.30 Меладрама «Спатканне ўсляпую».
16.20, 23.45 «Перазагрузка». Моладзевае ток-шоу.
17.00 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
18.55 Серыял «Маёр Ветраў». 1-я і 2-я серыі.
20.55 Цела чалавека.
21.25 КЕНО.
21.35 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».
22.45 Серыял «Рэальныя хлопцы».
0.25 Музычны конкурс «GBOB» у Беларусі.

БЕЛАРУСЬ 3

7.20 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 14.05, 17.00, 21.05, 0.30 «Калейдаскоп».
8.05, 14.10, 17.10, 0.35 «Энцыклапедыя беларускага спорту». Барацьба самба і дзюдо.
8.15 Дзіцячы фільм. «Фантазіі Вяснухіна».
10.20, 22.00 «Дыя@блог». «Пра мову».
10.50, 21.10 Серыял «Мегрэ».
11.35, 0.05 «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара, піяніста, педагога Рыгора Шаршэўскага.
12.00 «Чалавек на сваім месцы». Творчы вечар народнага артыста Расіі Уладзіміра Мяньшова.
13.00 «Час для роздуму». Маст. фільм.
14.20 «Плошча мастацтваў». Мастак — гэта лёс... Творчасць мастака Васіля Касцючэнкі.
14.50 «Глыбокае». Дак. фільм.
15.00 «Насталькжы». Кампазітар Людміла Шлег.
15.25 «Цуды прыроды». Вялікабрытанія. Казахстан. Кітай. Чэхія.
15.55 М/ф.
16.15 «Наша спадчына». Жалудоцкі палац.
16.40 «Імгненне вечнасці». Перакладчыца, паэтэса Надзея Вольпін і Сяргей Ясенін.
17.20 «Свет прыроды». Лесабалотны комплекс Чырвоны бор.
17.45 «Дакрананне». Дак. фільм.
18.15 «Карані». Паэты Кішынёва.
18.40 «Размаўляем па-беларуску».
18.45 «Скарбніца Магілёўшчыны». Палац Пацёмкіна.
19.15 «Дзіця да лістапада». Маст. фільм.
20.45 Калыханка.
22.30 «Пецярбургская ноч». Маст. фільм.

БЕЛАРУСЬ 5

8.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Фулхэм» — «Эвертан».
10.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Ліверпуль» — «Тотэнхэм».
11.55 Гандбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы. Беларусь — Нарвегія. Жанчыны.
13.20 Футбол. На шляху да чэмпіянату свету па футболе-2014. Відэачасопіс.
13.50 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 1 тур. «Днепр» (Магілёў) — «Дынама» (Мінск).
15.40 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Фінал.
17.30 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 1 тур. «Шахцёр» (Салігорск) — БАТЭ (Барысаў).
19.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
19.50 Авертайм.
20.20 Час футбола.
21.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
21.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Сандэрлэнд» — «Вест Хэм».

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «У наш час».
12.05 «Яны і мы».
13.10 «Справа ваша...».
13.55 «Модны прыгавор».
15.00 «Сам-насам з усімі».
16.15 «Зразумець. Даравацъ».
16.55 «Давай пажэнімся!».
18.20 «Адваротны адлік». «Эліза Ажэшка. Мяцежная душа».
19.00 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Пазіцыя».
22.05 Юбілейны канцэрт А. Саладухі.
23.20 Маст. фільм «Выкрадзеная».
1.05 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.45 «Вялікае снеданне».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.40 «Такі лёс».
12.30 «Сямейныя драмы».
13.50 «Вялікі горад».
14.30 «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». «Cover Duck» супраць «Inomarki».
15.30 «Не хлусі мне!».
16.20 «Наша справа».
16.50 «Следакі».
18.30 «Ежа багоў».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Маст. фільм «Твары ў натоўпе».
22.15 «Глядзець усім!».
23.00 «Ваенная тайна».

МІР

5.00 «180 хвілін».
7.15 Беларусь сёння.
8.15 Серыял «Іншае жыццё».
10.00, 0.50 Маст. фільм «Баламут».
11.30 «Наша марка».
12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
12.20 Серыял «Чужыя памылкі».
14.05, 4.05 Дак. фільм «Тайныя знакі».
15.20, 23.35 Ток-шоу «Слова за слова».
16.10, 3.40 Серыял «Монтэкрыста».
18.20 Серыял «МУР ёсць МУР 2».
21.20 Серыял «Галасы».
23.05 «Беларусь сёння».
0.25 Агульны інтарэс.
2.25 Серыял «Заручальны пярсцёнак».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Карціна свету».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Прамы эфір».
12.45 «Асаблівы выпадак».
13.50, 16.50, 19.50, 23.25 Навіны — Беларусь.
14.30 «Вайна 1812 года. Першая інфармацыйная».
15.35 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».
18.05 Серыял «Пакуль станіца спіць».
18.55 Серыял «Асабовая справа».
20.45 Серыял «Самара-2».
23.35 «Сакрэтныя матэрыялы: ключы ад даўгалецця».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.40 «Новыя рускія сенсацыі».
9.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.00 «Да суда».
11.55 «Суд прысяжных».
13.25 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.25 «Справа ўрачоў».
15.10 «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
15.40, 18.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 «Пракурорская праверка».
17.35 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.35 Серыял «Дзікі».
23.10 Сёння. Вынікі.
23.35 Маст. фільм «Госць».

8 КАНАЛ

7.00, 13.00, 19.05, 20.55, 23.55 «Надвор'е».
7.05 М/ф.
8.20 Камедыя «Аднакласніцы».
10.05 Серыял «Ведзьмы з Іст-Энда».
11.35 Камедыя «Прынцы паветра».
13.05 Серыял «Усё пра Еву», 1-2 серыі.
15.15 Серыял «Тайны Ніра Вульфа».
16.10 Мультпарад.
16.30 «Мой любімы гадаванец».
17.00 Серыял «Тэорыя хлусні».
17.55 Серыял «Служба навін».
19.10 Серыял «Тайныя сувязі».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Фантастыка «Чорная дзірка».
23.10 Серыял «Спіс кліентаў».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 18.15, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.00 Серыял «Святлафор».
10.00 «Яда па правілах і без».
11.00 «Жонкі алігархаў».
12.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
13.00, 23.15 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Скетч-шоу «Валера-ТБ».
15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».
16.00 Драма «Арол дзявятага легіёна».
18.30, 0.00 «Лаві момант».
20.00 Серыял «Кухня».
21.10 Камедыя «Прывітанне, мы ваш дах!».

КУЛЬТУРА

6.00 «Еўраньюс».
9.00, 14.00, 18.00, 22.40 Навіны культуры.
9.15, 0.40 «Наглядальнік».
10.15 «Пэры Мэйсан». Серыял.
11.10 «Сусветныя скарбы культуры».
11.25 «Лінія жыцця». Марк Пякарскі.
12.15 «Джаглавак — прынц насякомых». Дак. фільм.
13.10 «Курсанты». Серыял. 1-я серыя.
14.10 «Міхаіл Навахіжын. Тэатральны раман-с». Дак. фільм.
14.50 «Чалавек з акардэонам». Маст. фільм.
16.20 Р. Шчадрын. Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам.
17.10 Academia.
18.15 Галоўная роля.
18.30 «Саці. Нясумная класіка...».
19.10 «Правілы жыцця».
19.40 «Бэла Рудэнка. Я шчаслівы чалавек!». Дак. фільм.
20.20 «Тым часам».
21.05 Прыступкі цывілізацыі. «Страчаныя піраміды Кітая». Дак. фільм.
22.00 «Спакуса цывілізацыяй». Дак. фільм.
23.00 «Таемства Пікасо». Дак. фільм.
0.20 П.І. Чайкоўскі. Уверцюра-фантазія «Рамэа і Джульета».
1.40 Іграе Валерый Афанасьеў.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «СеўАлогія». «Дыскатэкі 80-х».
6.10 «Ранішняя зорка». 1992 год.
7.10 «Ансамбль няўдачнікаў». Маст. фільм.
8.00 «Шынок 13 крэслаў». 1968 год.
9.00 «Сем маленькіх аповедаў пра першае каханне». Маст. фільм.
10.10 «У афішах не значацца». Дак. фільм.
11.00 «Міжнародны дзень тэатра». 1990 год.
12.00, 3.00 «Колба часу».
13.00 «ПЕН-клуб». 1992 год.
14.00 «Інтэрв'ю ў музыкі. Мікіта Багаслоўскі». Фільм-канцэрт. 1986 год.
15.20 «...Лёсу майго простае палатно». Пра творчасць н.а. СССР Ніны Сазонавай. 1988 год.
16.35 «Гэта было, было... Зоркі замежнай эстрады 40-60 гг.». Кінаканцэрт. 1989 год.
17.00 «Ранічкаю». «Печкін-шоу». 1990 год.
18.00 «Р. Паўлс прадстаўляе Л. Вайкуле». Фільм-канцэрт. 1988 год.
18.35 «Дзень за днём». Тэлеаповесць. Глава першая.
20.00, 2.00 «Мінулы час».
21.00 «Народжаныя ў СССР».
22.00 «Смех скрозь гады, або Падаў мінулагодні снег». 1990 год. 1 частка.
23.00 «Камера глядзіць у свет». «Рускія ў Парыжы». 1990 год.
0.05 «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
0.30 «У адным мікрараёне». Тэлеспектакль. 1976 год.
4.00 «Кінапанарама». «Майстры сусветнага кіно. Стэнлі Крамер». 1984 год. 2 частка.

EUROSPORT

9.30, 14.00 Кёрлінг. Чэмпіянат свету сярод мужчын.
12.00 Конны спорт. Коннае скачковае шоу (канкур).
13.00 Веласпорт. Тур Каталоніі.
17.00, 20.30 Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая.
18.30 Футбол. Еўрагалы.
19.30 Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету.
21.45 WATTS.
22.00 Пра рэслінг.
23.30 Баявыя майстэрствы. Суперкамбат.
1.00 Футбол. Кубак свету (U-17).

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 2.20 Серыял «Прападобны».
5.45, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.50 Серыял «Дваццаць дванаццаць».
6.15 Камедыя «На рыбалку!».
7.45, 12.35, 1.50 «Камедыянты. Лепшае».
9.00 Меладрама «Стыльная штучка».
11.15 Камедыя «Тры дні з прыдуркам».
14.10 Мюзікл «Дарога ў Рыа».
17.20 Камедыя «Я не ведаю, як яна робіць гэта».
19.20 Камедыя «Дзякуй, што патурбавалі».
22.10 Камедыя «Эмігрант».
0.05 Камедыя «Мытня дае дабро».
3.25 Камедыя «Вялікі Руперт».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.00 «Сардэчна запрашаем дадому!».
8.45, 18.30, 3.00 «Забароненае каханне». Серыял.
10.15 «Паненка і кулінар».
10.45, 17.00 «Паралельны свет». Дак. серыял.
11.45, 16.00 «Варажбітка». Дак. серыял.
12.45, 18.00 «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
13.10 «Жонка. Гісторыя кахання». Ларыса Лупіян.
14.30 «Сто пытанняў дарослаяму». Ала Сігалава.
15.15, 23.45, 5.15 «Звышнатуральнае». Серыял.
20.20 «Адэса-мама». Серыял.
21.15, 4.30 «Чырвоная капэла». Серыял.
22.15 «Мядовы месяц Камілы». Маст. фільм.
0.30 «Хадзячыя мерцвякі». Серыял.
1.30 «Часова даступны». Марат Гельман.
2.20 «Без падману».

ТБ1000

5.00 М/ф «Рабі ногі».
7.20, 15.05 Камедыя «Спачатку каханне, потым вяселле».
9.05 М/ф «Труп нявесты».
10.30 Драма «Кароль гаворыць!».
12.40 Драма «Джэры Магуаер».
16.45 Камедыя «Мой хлопец — псіх».
19.00 Трылер «Недатыкальныя».
20.45 Камедыя «Лары Краўн».
22.30 Дэтэктыў «Перакладчыца».
0.45 Баявік «Марпехі».
2.55 Камедыя «Джэк і Джыл: Каханне на чамаданах».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Камедыя «Асаблівасці нацыянальнай палітыкі».
8.00 Драма «Залатое стагоддзе».
10.00 Меладрама «Мама паняволі».
12.10 Казка «Агонь, вада і... медныя трубы».
14.00 Меладрама «Атамны Іван».
16.00 Камедыя «Шапіто-шоу: Каханне і сяброўства».
18.00 Камедыя «Шапіто-шоу: Павага і супрацоўніцтва».
20.00 Меладрама «Вольнае плаванне».
22.00 Прыгоды «Ліса Аліса».
0.00 Меладрама «Здзелка».
2.00 Камедыя «Крымінальныя абставіны».
4.00 М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Сутыкненне з астэроідам.
6.00 Мядзведзі вострава Страху.
7.00, 16.00 Злачынствы супраць прыроды.
8.00, 13.00, 18.00, 20.00, 22.00, 3.00 Космас: Прастора і час.
10.00 Прыроджаны байкер.
11.00 Скарбашукальнікі.
12.00 Золата Юкана.
15.00 Апошняя львіца.
17.00, 2.00 Канвоі: бітва за Атлантыку.
21.00, 1.00, 4.00 Сканеры старажытнага свету.
0.00 Жыццё ў космасе.
2.00 Канвоі: бітва за Атлантыку.

DISCOVERY

7.00 Майстэрня «Фантом Уоркс».
7.50, 12.20 Сысці ад пагоні.
8.40 Як гэта ўстроена?
9.10, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35 Скарбашукальнікі Амерыкі 2.
10.30, 0.55 Top Gear.
11.25 Не спрабуйце паўтарыць.
13.15, 6.05 Вялікі махінатар.
14.10, 3.55 Хуткія і гучныя.
15.05 Беар Грылс: выбрацца жывым.
16.00 Пятая перадача.
16.25 Рэальныя дальнабойшчыкі.
22.00 Выжыванне без купюр.
23.00 Хлопцы з Юкана.
0.00 Кландайк.
1.50 Сапраўдныя аферысты.
2.40 Маланкавыя катастрофы.
3.05 Паляўнічыя на рэліквіі.
5.10 Цуды Сусвету.